# І ЕЖА, І БАГАЦЦЕ…

У мінскай мастацкай галерэі “Універсітэт культуры” праходзіць незвычайная выстава, прысвечаная… бульбе




Праект “Арт-бульба” прымеркаваны да Міжнароднага года гэтай гародніны, які аб’явіла Генеральная Асамблея ААН. Тым самым міжнародныя эксперты спадзяваліся звярнуць увагу дзяржаў на ролю бульбы, якую яна можа выконваць у барацьбе з голадам і для вынішчэння галечы ў свеце. Між іншым, бульба вырошчваецца ў 130 краінах, дзе пражывае тры чвэрці насельніцтва планеты, корміць мільёны людзей.

“Калі бульба ўзнеслася на сусветны ўзровень, то як жа было не выкарыстаць гэта нам, беларускім мастакам, як не адзначыць Год бульбы адпаведнай выставай!” — усміхаецца дырэктар мастацкай галерэі і аўтар арт-праекту Дзяніс Барсукоў. Тым больш што для беларусаў гэта свята можна назваць нават нацыянальным: Беларусь — сусветны лідэр па колькасці спажываемай бульбы на чалавека. У год на кожнага тут прыходзіцца амаль 860 кілаграмаў гэтага прадукту, а, да прыкладу, на бліжэйшага суседа-расіяніна — толькі 250.

“Для нас бульба — не проста ежа, але і своеасаблівы нацыянальны сімвал. Вырошчваючы і спажываючы яе, далучаешся да традыцый народа, атрымоўваеш эстэтычную асалоду. Гэта падобна да таго, як японцы штогод любуюцца квітнеючай сакурай,” — разважае Дзяніс. Мэта выставы, мяркуючы нават па назве “Арт-бульба”, — спалучыць высокае мастацтва з быццам бы звычайнай гароднінай, звярнуць увагу на бульбу і як на прадукт, і як на аб’ект творчасці. У праекце занята больш за 55 мастакоў, скульптараў, дызайнераў, фатографаў.

Для стварэння арт-аб’ектаў выкарыстаны самыя розныя матэрыялы: акварэль і акрыл, туш і алей, пластык і палатно, фанера і кардон, кераміка і шамот, бронза і мармур, дрэва і жалеза… І абавязкова — у кожным творы кропля гумару, фантазіі, крэатыву. Аўтары эксперыментуюць, прымяраюць на бульбе розныя вобразы. Бульба-тэлефон. Бульба-компас. Бульба — шакаладны батончык. Бульба-прышэлец (дарэчы, гэта першая гародніна, якую вырасцілі ў космасе, яшчэ у 1995 годзе). Бульба — залаты злітак...

Цікавыя не толькі ідэі, але нават назвы аб’ектаў: “Прынцэса на картошыне” (В.Высоцкая), “К-арт-кошка”(С. Стальмашонак) — кот з вочкамі па ўсім целе, “Nuts па-беларуску”(А.Валавік),“Каларадасць” (Т.Гомза) і іншыя. Бульба прадстаўлена на ўсіх этапах яе развіцця. Віктар Ціханаў нават цэлую серыю падрыхтаваў “Перыяд вегетацыі”: ад прабіцця першых парасткаў да з’яўлення на талерцы ўжо гатовых дранікаў. Дарэчы, на адкрыцці выставы смажаныя дранікі і бульбу з кропчыкам наведвальнікі маглі не толькіназіраць, але і смакаваць.

“Арт-бульба” — першая ў гісторыі Беларусі выстава, прысвечаная прадукту, які за 150 гадоў распаўсюджвання тут стаў нацыяльным. Праслаўляецца, дарэчы, другі хлеб і ў іншых краінах. У Расіі, скажам, штогод праводзіцца Дзень маладой бульбы, у Бельгіі існуе яе музей. Там больш за тысячу экспанатаў — ад марак да знакамітых карцін з выяўленнем бульбы. У тым ліку праца Ван Гога “Едакі бульбы”. Дарэчы, аднайменную серыю Аляксандра Някрашэвіча можна ўбачыць на беларускай выставе.

Людміла **Мінкевіч** ■